*1. Запішыце словы ў два слупкі наступным чынам: 1 — напісанне супадае з вымаўленнем; 2 — напісанне не супадае з вымаўленнем.Растлумачце правапіс.*

Выкладчык, асяроддзе, крыгаход, змяніцца, дзядзькаванне, вывесці, турысцкі, сшытак, адкрыць, расчыніць (акно), возчык, вакзал, грыбкі, ткацкі, грамадскі, ліцэй, цагліна, вуліца, рашчыніць (хлеб), святар, гоман, агарод, перапісчык, хараство.

2. *Спішыце сказы, устаўляючы прапушчаныя літары. Растлумачце правапіс і значэнне прыказак і прымавак.*

1. Свая сярмя..ка не ця..ка. 2. Дурная пту..ка сваё гн..здо не шануе. 3. Не кайся, позна лё..шы і рана ўстаўшы. 4. Начле.. з сабой ніхто не носіць, а ў людзей просіць. 5. Ідзі з людзьмі, то не згубі..ся. 6. Да чаго не дойдзеш, то ў кні.цы знойдзеш. 7. Баязліваму і корч мя..ведзь. 8. А..клад не ідзе ў ла.. . 9. Га..ка з'есці і шкада кінуць. 10. Гара з гарою не ..ходзіцца, а чалавек .. чалавекам с.дзецца. 11. Дарагая лы..ка к абеду. 12. Колькі вярова..цы ні віцца, а канцу быць. 13. Корань навукі горкі, ды плады сало..кія. 14. Мая капейка таксама не ..чарбатая. 15. Відаць, што бліны пякла: уся спадніца ў ро..чыне.

*3. Запішыце загадкі і адгадайце іх. Словы з падвоеным напісаннем зычных разбярыце па складу.*

1. Разаслана пасцілка, на пасцілцы рассыпаны сярэбраны пясочак, а пасярэдзіне залаты кружочак. 2. Матчыну скрыню не паднімеш, даччыну трубку не скатаеш, братнінага коніка не спаймаеш. 3. У цёмнай цямніцы панны кросны ткуць. 4. Не кароль, а ў кароне, не гусар, а пры шпорах, гадзінніка не мае, а час знае. 5. Хто мяне заб'е, той сваю кроў разалье. 6. Ляцела пава, на балота ўпала, распусціла крылле пад усялякае зелле. 7. Пяццюваламі ды адной сахой аруць.

4. Да *рускіх слоў дапішыце беларускія адпаведнікі. У чым асаблівасць правапісу беларускіх слоў?*

Выездной, вестник, солнце, радостный, сердце, счастливый, поздно, проездной, ненавистный, скоростной, областной, устный, постлать, немилосердный, постный, капустный, рекордный, контрастный, миллиардный, несчастный, обьездчик, аванпостный, балластный, форпостный.

*5. Перакладзіце сказы на беларускую мову. Запішыце і растлумачце правапіс спалучэнняў зычных у беларускамоўным варыянце.*

1. Везде чувствовалась радостная, торопливая тревога жизни. *2.* Время было позднее, солнце уж давно село. 3. Первым вестником наступающей весны являются грачи, скворцы, жаворонки. 4. Ростов чувствовал, как кровь со стуком приливает к сердцу. 5. Фермеры отдают предпочтение компостному удобрению, которое и стоит дешевле, и эффективнее. 6. Лестница крутая вела меня на башню. 7. Контрастность полученного негатива воодушевила сыщиков. 8. По гигантским паутинам поспешно ползали большие пауки . 9. По реке радостно мчатся синие волны.